Святлана Зыгмантовіч
Лілія Дзямешка
Ніна Клімянкова

*Працягваем размову*

# Новыя спецыяльнасці на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры



Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый знаходзіцца на пачатку новага этапа ў сваім развіцці: ідзе падрыхтоўка для пераводу працэсу навучання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на новую двухступеньчатую сістэму – бакалаўрыят – магістратура, рэалізацыя якой патрабуе аднаўлення зместу, тэхналогій навучання, істотнага паляпшэння якасці універсітэцкай адукацыі. Неабходнасць пераходу на новую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў выклікана сусветнымі адукацыйнымі тэндэнцыямі, звязанымі з павелічэннем масавасці вышэйшай адукацыі і неабходнасцю ідэнтыфікацыі, эквівалентнасці з мэтай стварэння адзінай адукацыйнай прасторы ў краінах СНД, Еўропы, свету, а таксама павышэння прафесійнай мабільнасці выпускнікоў ВНУ розных краін.

Навуковыя напрацоўкі, замежны вопыт, а таксама вынікі эксперыменту па ўвядзенню шматступеньчатай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў у рэспубліцы даюць магчымасць вызначыць мэтавую накіраванасць падрыхтоўкі бакалаўраў як малодшых спецыялістаў шырокага профілю з вышэйшай адукацыяй, падрыхтаваных да самастойнай працы па профілю спецыяльнасці; магістраў як спецыялістаў, якія атрымалі дадатковую падрыхтоўку ў пэўным напрамку і абаранілі магістарскую дысертацыю. У залежнасці ад тыпу магістарскай падрыхтоўкі (акадэмічная ці даследчая) выдзяляюць кваліфікацыю магістраў: магістр-менеджэр, які павінен валодаць навейшымі тэхналогіямі кіравання, і магістр-даследчык, які будзе займацца навуковай альбо навукова-педагагічнай дзейнасцю.

З пераходам на шматузроўневую сістэму падрыхтоўкі кадраў актуальным з'яўляецца і вызначэнне спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якіх будуць рыхтавацца спецыялісты, запатрабаванасць іх практыкай.

Сучасная сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па сямі спецыялізацыях (інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу; бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства; бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва; маркетынг бібліятэчнай справы; бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова; кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю; аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы).

Са скарочаным тэрмінам навучання рыхтуюцца спецыялісты па бібліятэчнаму абслугоўванню дзяцей і юнацтва (на базе Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума) і па маркетынгу бібліятэчнай справы (на базе Мінскага лінгвістычнага каледжа-гімназіі № 24).

Двайную спецыяльнасць атрымліваюць выпускнікі, якія навучаюцца на спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура».

Аднак сучасныя тэндэнцыі ў развіцці інфармацыйна-дакументных камунікацый, абумоўленыя інфарматызацыяй грамадства і праблемамі гуманізацыі асобы, якія, на наш погляд, з'яўляюцца вызначальнымі фактарамі фарміравання сацыяльнага заказу на прафесійныя веды бібліятэчных работнікаў, дазваляюць нам, выкладчыкам кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, паставіць пытанне аб падрыхтоўцы кадраў па здвоеных спецыяльнасцях, што дазволіць, з аднаго боку, павялічыць мабільнасць выпускнікоў на рынку працы, а з другога – значна павысіць грунтоўнасць прафесійнай падрыхтоўкі будучых бібліятэкараў.

Мы прапануем распачаць падрыхтоўку спецыялістаў па здвоенай спецыяльнасці **«Бібліятэказнаўства і бібліяграфія. Прафесійнае навучанне»** з кваліфікацыяй **«Бібліятэкар-бібліёграф. Выкладчык спецыяльных дысцыплін»**. Актуальнасць падрыхтоўкі такіх спецыялістаў выклікана неабходнасцю забеспячэння кваліфікаванымі кадрамі, здольнымі ажыццяўляць адукацыйны працэс у каледжах, тэхнікумах, вучылішчах па падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў сярэдняга звяна; весці заняткі ў вучэбна-вытворчых камбінатах; задавальняць патрэбнасці практыкаў у адукацыйных паслугах з боку бібліятэк-метадычных цэнтраў. Спецыялісты такой кваліфікацыі больш прафесійна спрыялі б вырашэнню і такой задачы агульнанадзяржаўнай значнасці, як садзейнічанне фарміраванню інфармацыйнай культуры грамадства і кожнай асобы. Менавіта работнікі бібліятэк адукацыйных устаноў актыўна ўключаюцца ў на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучальны працэс. Яны ажыццяўляюць распрацоўку аўтарскіх вучэбных праграм і метадычных матэрыялаў; праводзяць арганізаваныя формы заняткаў па такіх прадметах, як «Асновы бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў», «Інфармацыйная культура школьніка», «Інфармацыйная культура спецыяліста»; здзяйсняюць працэс навучання карыстальнікаў інфармацыі непасрэдна ў бібліятэках праз кароткатэрміновыя курсы, цыклы лекцый, кансультацыі з мэтай фарміравання сістэматызаваных ведаў, уменняў і навыкаў інфармацыйнай дзейнасці карыстальнікаў бібліятэк.

Бібліятэкі садзейнічаюць рэалізацыі і такой задачы, як адукацыя дарослых, альбо «адукацыя праз усё жыццё». Гэта адбываецца шляхам фарміравання інфармацыйнай культуры насельніцтва, садзейнічання задавальненню пазнавальных, адукацыйных патрэбнасцей праз кансультацыйнае і адукацыйнае пасрэдніцтва. Бібліятэкі выступаюць як эфектыўная інфраструктура для пастаяннага навучання і арганізацыі доступу да віртуальных сетак. Работа бібліятэк па арганізацыі сучаснай дыстанцыйнай адукацыі як адной з форм бесперапыннай адукацыі – перспектыўная форма пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнай дзейнасці бібліятэк. З гэтай мэтай у бібліятэках пачалі ствараюцца спецыяльныя структурныя падраздзяленні па навучанню карыстальнікаў.

Для выканання пералічаных кірункаў дзейнасці патрэбны высокакваліфікаваныя кадры – бібліятэкары-педагогі, якія валодаюць педагагічнымі тэхналогіямі, формамі і метадамі арганізацыі навучальнага працэсу, выхавання.

Для падрыхтоўкі бібліятэкараў – выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін факультэт мае аб'ектыўныя падставы. Студэнты атрымліваюць спецыяльную бібліятэказнаўчую падрыхтоўку, што з'яўляецца прадметам выкладання для выкладчыкаў разглядаемага профілю; у навуковым плане ў бібліятэказнаўстве існуюць навуковыя школы ў галіне педагогікі чытання, падрыхтоўкі бібліятэкараў да работы па фарміраванню культуры чытання, бібліятэчна-бібліяграфічнай граматнасці, інфармацыйнай культуры карыстальнікаў; назапашаны значны вучэбна-метадычны вопыт выкладання спецыяльных дысцыплін; падрыхтаваны падручнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, якія маюць безумоўную навукова-метадычную каштоўнасць і апрабіраваны ў практыцы работы кафедр факультэта.

Факультэт інфармацыйна-дакументных сістэм мае падрыхтаваны штат высокакваліфікаваных выкладчыкаў для рэалізацыі пастаўленных мэт, адпаведную матэрыяльна-тэхнічную базу.

Другая здвоеная спецыяльнасць, на якую мы звяртаем увагу, – **«Бібліятэказнаўства і бібліяграфія. Практычная псіхалогія»** з прысваеннем кваліфікацыі **«Бібліятэкар-бібліёграф. Псіхолаг».** Галоўная мэта адкрыцця такой спецыяльнасці – задаволіць патрэбнасці публічных, дзіцячых і іншых бібліятэк у кваліфікаваных кадрах, здольных не толькі аказваць разнастайныя псіхалагічныя паслугі карыстальнікам і персаналу, арганізаваць і падрымліваць псіхалагічную службу, але і прадастаўляць бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі з улікам псіхалагічных асаблівасцей абанентаў, выкарыстоўваючы дасягненні бібліятэрапіі, агульнай, узроставай псіхалогіі. Асаблівую ролю могуць адыграць такія спецыялісты ва ўмовах невялікіх бібліятэк у сельскай мясцовасці, дзе арганізацыйныя структуры псіхалагічнай службы практычна адсутнічаюць, а бібліятэка з'яўляецца адной з нешматлікіх, а часцей і адзінай установай, што займаецца распаўсюджаннем псіхалагічнай культуры сярод насельніцтва. Бібліятэкар-псіхолаг тут можа быць арганізатарам псіхалагічнай службы, выконваць функцыі школьнага псіхолага, псіхолага пры іншых дзіцячых установах, праводзіць заняткі, трэнінгі, прадухіляць і вырашаць канфлікты.

Асабліва запатрабаваны спецыяліст такой кваліфікацыі ў населеных пунктах, дзе неабходна праводзіць мэтанакіраваную работу па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Мэтазгоднасць і своечасовасць адкрыцця на кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы падвоенай спецыяльнасці «бібліятэкар-псіхолаг» падкрэсліваюць наступныя акалічнасці:

– існуюць пэўныя прадумовы падрыхтоўкі кадраў (распрацаваны і метадычна забяспечаны шэраг дысцыплін псіхалагічнага накірунку: «Псіхалогія чытання», «Бібліятэчныя зносіны», «Бібліятэрапія», «Дзіцячае чытачазнаўства», «Бібліятэчная канфліктaлогія»);

– узнікла неабходнасць уvядзення пасады псіхолага ў бібліятэках, які б мог узначаліць псіхалагічныя службы, кіраваць гуртккамі, клубамі па інтарэсах, быць прафесійным арганізатарам чытацкіх стасункаў, ажыццяўляць бібліятэрапію як індывідуальна, так і ў межах кантактных груп, аказваць псіхалагічную дапамогу сацыяльна неабароненым пластам насельніцтва;

– наяўнасць псіхолага-прафесіянала ў публічнай бібліятэцы значна пашырае і паглыбляе дыяпазон яе ўздзеяння на насельніцтва, складае прадумовы для павышэння сацыяльнай значнасці бібліятэкі, спрыяе стварэнню станоўчага іміджу бібліятэкі і бібліятэкара;

– павышэнне псіхалагічнай адукаванасці калектыву публічнай бібліятэкі, дзе працуюць у асноўным жанчыны, будзе станоўча ўплываць на фарміраванне аптымальнага маральна-псіхалагічнага клімату, што істотна павышае эфектыўнасць абслугоўвання;

– распаўсюджанне сярод насельніцтва псіхалагічных ведаў, павышэнне адукаванасці ў дадзенай галіне менавіта праз бібліятэку перспектыўна і ў плане прафілактыкі дэвіянтных паводзін, аздараўлення агульнай сацыяльна-псіхалагічнай атмасферы ў грамадстве.

На сучасны момант бібліятэкі вымушаны пасылаць на вучобу без адрыву ад вытворчасці на факультэты псіхалогіі сваіх супрацоўнікаў, якіх не заўсёды задавальняюць атрыманыя веды, таму што выкладанне вядзецца без уліку бібліятэчнай спецыфікі.

Істотная роля бібліятэкі ў развіцці грамадства вымагае распрацоўкі і ўкаранення новых інфармацыйных і сацыяльных методык і тэхналогій, звязаных з навуковым выкарыстаннем дакументна-інфармацыйных рэсурсаў, стварэннем спрыяльнага для духоўнага развіцця грамадства асяроддзя, розных мадэлей сацыякультурных праграм і праектаў. Таму мы прапануем такую



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльнасць, як **«Бібліятэкар-бібліёграф. Арганізатар сацыякультурнай дзейнасці».** Фактычна гэтая пасада неабходна ва ўсіх установах, якія прызваны аказваць дапамогу розным катэгорыям насельніцтва ў арганізацыі і культурным правядзенні вольнага часу; прафілактыцы і прадухіленні дэвіянтных паводзін; у сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей з абмежаванымі псіхафізічнымі магчымасцямі.

Тыпалогія ўстаноў, якія адчуваюць патрэбу ў бібліятэкарах-бібліёграфах, арганізатарах сацыякультурнай дзейнасці, даволі шырокая. Гэта, у першую чаргу, ***установы культуры*** (публічныя, спецыяльныя, навуковыя бібліятэкі; сельскія клубы, аб'яднаныя з сельскімі бібліятэкамі); ***адукацыйныя ўстановы*** са структурнымі падраздзяленнямі бібліятэк ці бібліятэчных пунктаў (дашкольныя, агульнаадукацыйныя, школы-інтэрнаты, гімназіі-каледжы, установы для дзяцей-сірот, спецадукацыйныя ўстановы для дзяцей і падлеткаў з дэвіянтнымі паводзінамі, прафесійна-тэхнічныя адукацыйныя ўстановы).

Акрамя таго, бібліятэкі існуюць пры *вытворчых аб'яднаннях* (перш за ўсё прамысловых), ва ўстановах *аховы здароўя* (бальніцы, спецбальніцы для псіхічна хворых, санаторыі, прафілакторыі); ва *ўстановах сацыяльнай абароны насельніцтва* (сацыяльных прыютах, рэабілітацыйных цэнтрах); ва *ўстановах, якія адносяцца да органаў унутраных спраў* (спец. інтэрнатах, спец. прафесійных вучылішчах, выхаваўчых калоніях і інш.).

Бібліятэкар-бібліёграф, арганізатар сацыякультурнай дзейнасці можа быць арыентаваны на работу не толькі ў дзяржаўных установах, а і ў іншых установах і арганізацыях – грамадскіх ці грамадска-дзяржаўных, яго пасада вызначаецца нарматыўнымі дакументамі, якія рэгулююць дзейнасць пэўнай установы.

У двайной прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа і арганізатара сацыякультурнай дзейнасці ёсць шмат агульнага: аб'ектам дзейнасці з'яўляюцца розныя групы насельніцтва, а мэтай – арганізацыя і змест правядзення дасугу з максімальным выкарыстаннем бібліятэчных інфармацыйных рэсурсаў. Функцыянальная дзейнасць бібліятэкара-бібліёграфа блізкая як да прафесійнай дзейнасці бібліятэкара, так і да дзейнасці культуролага, спецыяліста па сацыяльнай рабоце, псіхолага, педагога, але сродкі і магчымасці значна шырэйшыя.

Дзейнасць жа бібліятэкара-бібліёграфа, арганізатара сацыякультурнай дзейнасці непарыўна звязана з веданнем і выкарыстаннем бібліятэчна-бібліяграфічных сродкаў, тэхналогіі, рэсурсаў.

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) мае магчымасць распачаць падрыхтоўку спецыялістаў двайной кваліфікацыі – бібліятэкараў-бібліёграфаў, арганізатараў сацыякультурнай дзейнасці з улікам сучасных патрабаванняў, на прынцыпова іншым падыходзе да навучання студэнтаў. Гэты падыход засноўваецца на комплексным вывучэнні шэрага бібліятэказнаўчых, дакументазнаўчых, інфармацыйных, культуразнаўчых, сацыяльна-педагагічных дысцыплін з выкарыстаннем інтэграцыйных метадаў і прынцыпаў авалодання інфармацыйнымі і сацыяльнымі тэхналогіямі.

Адкрыццё двайной спецыяльнасці «бібліятэкар-бібліёграф, арганізатар сацыякультурнай дзейнасці» на ФІДК адказвае перспектыўным запатрабаванням у падрыхтоўцы спецыялістаў, якія свабодна арыентуюцца ў палітыцы сацыякультурнай дзейнасці, дзейнасці інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Факультэт мае базу падрыхтоўкі такіх спецыялістаў: высокакваліфікаваныя кадры, неабходныя матэрыяльныя рэсурсы, навуковыя і вучэбна-метадычныя матэрыялы.

Мы лічым, што накопленыя традыцыі і вопыт падрыхтоўкі на працягу амаль 60-ці гадоў бібліятэчных кадраў з'яўляюцца карысным і значным падмуркам для падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі і ў сумежных з бібліятэчнай справай сферах, якія забяспечваюць функцыянаванне дакументных камунікацый у грамадстве, у прыватнасці, для кніжнага гандлю. Аб неабходнасці зблiжэння працэсу падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасцях **«Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «Кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю»** і прысваення выпускнікам кваліфікацыі **«Бібліятэкар-бібліёграф. Менеджэр кніжнага гандлю»** сведчаць наступныя факты: для бібліятэчнай справы і кніжнага гандлю агульным аб'ектам дзейнасці з'яўляецца кніга; агульнымі з'яўляюцца і многія тэхналагічныя працэсы, звязаныя з бібліяграфічным, інфармацыйным афармленнем кнігі (вызначэнне індэксаў ISBN, УДК, ажыццяўленне штрыхавога кадзіравання, выкарыстанне агульных фарматаў прадастаўлення даных аб кнігах і г.д.), інфармацыйным суправаджэннем яе прадстаўлення на інфармацыйным рынку, ажыццяўленнем інфармавання аб кнігах карыстальнікаў інфармацыі. Кніжны рынак сёння ўсе больш актыўна выкарыстоўвае бібліяграфічныя метады гандлю, якія ў заходніх краінах ужо пакалі свае перавагі. Асабліва відавочнае збліжэнне тэхналогій ва ўмовах укаранення інфармацыйных, аўтаматызаваных тэхналогій: гандаль праз падрыхтоўку і распаўсюджванне бібліяграфічных каталогаў, каталогаў «Books in Print», бібліяграфічнай інфармацыі на CД-ROM-дысках, на сайтах кніжных магазінаў у Інтэрнет і інш. Таму ў штатным раскладзе кнігарняў усе часцей можна сустрэць пасаду бібліёграфа, падрыхтоўка якога вядзецца на факультэце прафілявана да бібліятэчнай сферы.

Аб збліжэнні разглядаемых кніжных сфер культурнай дзейнасці – бібліятэчнай і кніжнага гандлю – сведчаць таксама навуковыя даследаванні па распрацоўцы адзінай платформы развіцця выдавецкай, кнігагандлёвай і бібліятэчнай справы ў Расіі, распрацоўка спецыяльнай праграмы збліжэння нарматыўнай базы для выдаўцоў, кнігагандляроў і бібліятэк.

Аб актуальнасці адкрыцця на факультэце спецыяльнасці «Кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю» сведчаць таксама наступныя фактары: рынак працы для спецыялістаў – арганізатараў кніжнага гандлю – дакладна акрэслены і даволі значны, ён уяўляе сабою не толькі кніжныя магазіны дзяржаўнай формы ўласнасці, якіх сёння ў рэспубліцы каля 100, але і больш 600 суб'ектаў недзяржаўнай формы ўласнасці (камерцыйны кніжны гандаль, ствараемыя кнігагандлёва-выдавецкія комплексы, арганізацыя кніжных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кірмашоў і інш.); патрэбнасці кнігагандлёвых арганізацый у такіх спецыялістах вельмі значныя, аб чым сведчаць вынікі праведзенага ў 2001 г. даследавання адміністрацыяй Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа паліграфіі імя В.Харужай сумесна з Міністэрствам інфармацыі РБ; адкрыццё падрыхтоўкі на факультэце прапанаванай спецыяльнасці дазволіць стварыць умовы для арганізацыі бесперапыннай падрыхтоўкі кадраў у сістэме «Мінскі прафесійна-тэхнічны каледж паліграфіі – БДУ культуры»; нарэшце, факультэт з 1996 г. вядзе падрыхтоўку бібліятэчных кадраў па спецыялізацыі «Кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю» з адпаведным блокам праблемна арыентаваных курсаў, арганізацыяй вытворчай практыкі ў кніжных магазінах, абаронай дыпломнай работы па спецыялізацыі.

Падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для кнігагандлёвых прадпрыемстваў у іншых навучальных установах краіны не вядзецца, таму ва ўмовах нацыяльнай незалежнасці гэтую задачу можна разглядаць як задачу дзяржаўнай значнасці.

Для падрыхтоўкі магістраў па бібліятэчнай спецыяльнасці кафедра прапаноўвае спецыялізацыю **«Менеджмент бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці»**. Вобласць прафесійнай дзейнасці выпускніка з кваліфікацыяй «Менеджэр інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці» – тэорыя і практыка кіравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю.

Ён павінен валодаць навыкамі стратэгічнага, тактычнага і аператыўнага кіравання персаналам, структурнымі падраздзяленнямі і накірункамі бібліятэчнай работы. Асноўныя віды дзейнасці спецыяліста: планаванне і арганізацыя бібліятэчнай дзейнасці, мадэляванне арганізацыйных структур бібліятэкі, укараненне сістэм маркетынгавага кіравання, выкарыстанне форм і метадаў мэтанакіраваных паводзін персаналу ў сістэме менеджменту, экспертна-кансультацыйная дзейнасць па пытаннях функцыянавання бібліятэчна-інфармацыйнай сферы і інш. Менеджэр павінен валодаць ведамі сістэмнага падыходу да праектавання структур кіравання, выкарыстання норм прававога рэгулявання бібліятэчнай дзейнасці, выкарыстоўваць у сваёй рабоце метады функцыянальна-эканамічнага аналізу дзейнасці бібліятэкі.

У адпаведнасці з гэтымі задачамі і мэтамі, а таксама практычным вопытам па падрыхтоўцы кадраў у межах спецыялізацыі «Менеджмент у бібліятэчнай справе» на кафедры распрацоўваюцца вучэбныя планы і праграмы, якія прадугледжваюць уключэнне шырокага кола дысцыплін, як ужо выкладаемых, так і цыкл інавацыйных курсаў.

Фундаментальная частка профільнай менеджэрскай падрыхтоўкі можа быць паспяхова рэалізавана пры дапамозе паслядоўнага засваення комплексу вучэбных дысцыплін, якія ў большасці маюць апрабіраваную вучэбна-метадычную дакументацыю і адаптаваныя дыдактычныя распрацоўкі. На кафедры сёння выкладаюцца: курсы «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент», які дазваляе студэнтам засвоіць тэорыю і пазнаёміцца з практыкай кіравання работай бібліятэкі ў кантэксце дасягненняў сусветнага менеджменту; «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», які дае магчымасць вывучыць тэарэтычныя асновы і прыкладныя прыёмы профільнага маркетынгу, выкарыстоўваць маркетынгавы інструментарый з улікам спецыфікі бібліятэкі; «Інавацыйны менеджмент», «Фінансава-эканамічны бібліятэчны менеджмент», «Бібліятэчная статыстыка», «Офіс-менеджмент». Прапаноўваецца ўвесці ў вучэбны план шэраг новых курсаў: «Бібліятэчнае права» з мэтай забяспечыць вывучэнне студэнтамі юрыдычных норм, якія рэгулююць праваадносіны ў працэсе бібліятэчнай дзейнасці; «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці», у якім будуць прадстаўлены мікраэканамічныя аспекты і раскрываецца каналы рэсурснага забеспячэння дзейнасці бібліятэкі; «Кіраванне бібліятэчнай справай», які дазволіць больш глыбока вывучаць пытанні кіравання бібліятэчнай сферай як галіной дзейнасці, прааналізаваць развіццё і сучасныя прыярытэты дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі; «Інавацыйна-метадычная работа бібліятэкі» накіраваны на вывучэнне метадалогіі і арганізацыі кіравання інавацыйнымі працэсамі ў бібліятэцы, засваенне сучасных форм прафесійнай метадычнай дзейнасці; курсы «Дакументацыйнае забеспячэнне кіравання», «Стратэгічнае кіраванне бібліятэкай», «Кіраванне бібліятэчным персаналам».

Выпускнікі як дыпламаваныя спецыялісты вышэйшай кваліфікацыі змогуць працаваць дырэктарамі, намеснікамі дырэктараў, загадчыкамі бібліятэк, загадчыкамі аддзелаў і сектараў у бібліятэках са складанымі арганізацыйнымі структурамі, спецыялістамі аддзелаў культуры раённых, гарадскіх, абласных органаў кіравання, спецыялістамі аддзелаў маркетынгу і навукова-метадычных аддзелаў, у камерцыйных кансалтынгавых і інфармацыйных фірмах.

Увядзенне новых спецыяльнасцей – інтэлектуальна ёмкая задача, таму да распрацоўкі канцэпцый новых спецыяльнасцей, вучэбных планаў, непасрэдна да вучэбнага працэсу пажадана далучэнне вядучых спецыялістаў, кіраўнікоў бібліятэк – лідэраў прафесійнай сферы, якія маглі б выступіць і ў якасці прафесійных экспертаў па пытаннях актуальнасці, значнасці прапанаваных спецыяльнасцей і спецыялізацый, і ў якасці выкладчыкаў.

Запрашаем для размовы на старонках часопіса «Бібліятэчны свет».



Summary

The article of S. Zigmantovich a.o. is dedicated to modern tendencies in development of information and documentary communications at the Belarussian Culture University.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ